# НА ДАХУ СВЕТУ



## Што адбываецца ў загадкавым Непале?

Інфармацыя пра Непал перыядычна з'яўляецца ў стужках сусветных інфармагенцтваў. У пераважнай большасці — у сувязі з катастрофамі і іншымі надзвычайнымі здарэннямі. У жніўні галоўная навіна адсюль тычылася палітыкі.

Пушпа Камал Дахау, лідар Аб'яднанай камуністычнай партыі Непала (мааісцкай), быў абраны кіраўніком урада пры падтрымцы найбуйнейшай партыі «Непальскі кангрэс» і Аб'яднанага дэмакратычнага фронту мадхесі. За яго прагаласавалі 363 дэпутаты з 595. Кандыдатура 61-гадовага Дахау, вядомага таксама пад мянушкай таварыш Прачанда (Люты), была адзінай, унесенай на галасаванне. Што ж адбываецца ў самай «вышыннай» краіне свету?

### ГІСТАРЫЧНЫ ТРЫЛЕР

Кажуць, што некалі даліна Катманду ляжала на дне вялізнага горнага возера. Пасля землятрусу вада адсюль сышла (згодна з легендай бадхісатва Манджушры рассек ваду магічным мячом; па іншай версіі, гэта быў сам Крышна, які з дапамогай кія ўтварыў Чобарскую цясніну), і даліна была заселена людзьмі з навакольных рэгіёнаў, якія ўтварылі народ невар. Даліна адрознівалася высокай урадлівасцю, а тутэйшыя жыхары — вялікімі талентамі ў мастацтве і рамёствах, яны сталі славутымі ва ўсёй Усходняй Азіі.

Яшчэ да нашай эры сюды прыйшоў будызм (па адной з версій, менавіта тут нарадзіўся Буда). Непал стаў апорай гэтай рэлігіі ва ўсім гімалайскім рэгіёне, а таксама важным перавалачным пунктам на гандлёвых шляхах паміж Індыяй, Тыбетам і Кітаем. Праўда, пасля сітуацыя змянілася, і цяпер тут уладарыць індуізм.



Непал з'яўляецца самай высакагорнай краінай свету — каля 40% усёй тэрыторыі знаходзіцца на вышыні больш чым 3000 метраў. Менавіта тут волатамі стаяць 8 з 14 існуючых вяршыньвасьмітысячнік. Найвышэйшы пік усёй планеты — Эверэст (8848 м) — таксама знаходзіцца на тэрыторыі гэтай краіны.

Росквіт Непала адбыўся падчас праўлення неварскай дынастыі Малах у XIII—XVII стагоддзях, якая пакінула найбольш прыкметны след у гісторыі. Цудоўныя архітэктурныя помнікі тых часоў, што захаваліся дагэтуль, у значнай ступені сфарміравалі своеасаблівае аблічча краіны ў вачах усяго свету. Нездарма эпоха праўлення Малах носіць назву «Залатая эра». У 1768 годзе кароль царства Горкха Прытві Нараян Шах перанёс сталіцу ў горад Катманду. Такім чынам быў пакладзены пачатак праўленню ў Непале дынастыі Шах. Хоць у традыцыйным перакладзе тытул уладароў Непала заўсёды гучаў як «кароль», у арыгінале ён гучыць як «шах-ін-шах» (шах сярод шахаў) — аналагічна, як і традыцыйны тытул уладароў Ірана і іншых краін Усходу.

Мірны дагавор у Англа-непальскай вайне 1814—1816 гадоў у асноўным вызначыў сучасныя межы Непала і зрабіў дзяржаву залежнай ад брытанскай кароны. 15 верасня 1846 года змоўшчыкі на чале з Джангам Бахадурам — маладым славалюбівым і жорсткім арыстакратам з касты Чхетры — здзейснілі крывавы палацавы пераварот. Больш за стагоддзе дынастыя Рана кіравала краінай, і хоць гэты час характарызуецца ізаляцыяй краіны і стагнацыяй амаль ва ўсіх галінах, Непал здолеў захаваць сваю незалежнасць, трапіўшы ў становішча паўкалоніі Брытанскай імперыі. 1 студзеня 1923 года быў заключаны дагавор «аб дружбе» з Вялікабрытаніяй, краіна атрымала фармальную незалежнасць.

Найноўшая гісторыя Непала выглядае як захапляльны трылер у фармаце «мыльных серыялаў». Між тым гэтыя падзеі праясняюць цяперашні расклад сіл. Напрыканцы 1950 года кароль Трыбхуван пакінуў свой палац, схаваўшыся ў пасольстве Індыі, адкуль ён затым збег у гэтую краіну. Тым часам прыхільнікі нядаўна створанай палітычнай партыі «Непальскі нацыянальны кангрэс» (ННК) захапілі ўладу на большай частцы тэрыторыі і сфармавалі часовы ўрад у памежным з Індыяй мястэчку Біргандж. У Непале пачаліся сутыкненні прыхільнікаў ННК і дынастыі Рана, падчас якіх ні адна сіла не дасягнула вырашальнай перавагі. Тады ўмяшалася Індыя, і прапанаваны ёю план урэгулявання быў прыняты абодвума бакамі. У адпаведнасці з ім кароль Трыбхуван вярнуўся ў сталіцу ў 1951 годзе і сфарміраваў новы ўрад, які ўключаў і прыхільнікаў Рана, і прадстаўнікоў ННК.

### ПРЫЦЕМКІ БАГОЎ

З векавой ізаляцыяй краіны было скончана: Непал наладзіў адносіны з многімі дзяржавамі свету. У 1955 годзе кароль Трыбхуван памёр (яго імем названы, у прыватнасці, сталічны аэрапорт), і на пасаду ўступіў яго сын Махендра. Ён абвясціў новую канстытуцыю, у адпаведнасці з якой у 1959 годзе ў Непале усталёўвалася парламенцкая сістэма. Аднак праз тры гады, у 1962-м, кароль Махендра прызнаў «эксперымент» няўдалым і распусціў парламент. 16 мая 1962 года з'явілася новая канстытуцыя, у адпаведнасці з якой Непал зноў пераходзіў да абсалютнай манархіі. Як вынік, прэм'ер-міністр і члены парламента былі арыштаваныя і рэпрэсіраваныя, а ў краіне наступныя 28 гадоў захоўвалася абсалютная манархія.

У 1972 годзе кароль Махендра памёр, і на пасаду ўступіў яго сын Бірэндра, які атрымаў бліскучую адукацыю ў Ітане і Гарвардзе. Прадэмакратычныя рухі сярод студэнтаў падштурхнулі новага караля да рашэння правесці ў маі 1980 года самую дэмакратычную працэдуру — рэферэндум, на які выносілася пытанне аб характары будучага ўрада. Непальцам былі прапанаваны два варыянты: захаванне абсалютнай манархіі пры правядзенні дэмакратычных рэформаў і пераход да шматпартыйнай сістэмы. Тады на рэферэндуме большасць жыхароў выказаліся за манархічны лад.

Разам з тым насельніцтва, якое ў большасці сваёй чакала неадкладнага паляпшэння жыцця пасля ўвядзення дэмакратыі, праз пэўны час расчаравалася ў кіруючай партыі. У краіне зноў пачаліся масавыя беспарадкі, і ўрад быў вымушаны прызначыць датэрміновыя выбары ў 1994 годзе. На гэтых выбарах перамогу атрымала Аб'яднаная камуністычная партыя (марксісцка-ленінская) пад кіраўніцтвам Ман Мохан Адхікары. Стварылася ўнікальная палітычная сітуацыя: урад, сфарміраваны камуністамі, пры тэакратычнай манархіі (Непал — адна з нешматлікіх краін, у якіх індуізм абвешчаны дзяржаўнай рэлігіяй). Аднак гэтая сітуацыя праіснавала нядоўга.

У 1996 годзе Камуністычная партыя Непала (мааісцкая) пачала грамадзянскую вайну, падчас якой загінула больш за 10 тысяч чалавек. Партызаны, як гэта часта бывае ў такіх сітуацыях, кантралявалі амаль усе цяжкадаступныя горныя раёны, а ўрад — сталіцу і буйныя гарады. Падтрымка Індыі і ЗША на расстаноўцы сіл практычна не адбівалася. Паўстанцаў падтрымалі мясцовыя сяляне, якія пачалі сотнямі ўступаць у партызанскія атрады. Паўстанцкі рух пашыраўся, захопліваючы ўсё новыя тэрыторыі. Разам з тым, мааісты падкрэслівалі, што яны не вядуць вайну супраць турыстаў. За ўвесь час баявых дзеянняў не загінуў ніводзін замежны турыст.

Палітычная нестабільнасць у краіне асабліва ўзмацнілася з чэрвеня 2001 года, калі наследны прынц Дыпендра расстраляў усю сваю сям'ю і застрэліўся сам, пры гэтым загінуў кароль Бірэндра. На троне апынуўся вельмі непапулярны ў краіне брат забітага караля Г'янендру. Ён звярнуўся да шэрагу мераў, аж да забароны палітычных партый і роспуску ўрада, перамяжоўваючы актыўныя ваенныя дзеянні супраць мааістаў з перамовамі.

У красавіку 2008 года мааісты прыйшлі да ўлады падчас выбараў у Канстытуцыйны сход Непала — з 601 месца яны атрымалі 220. Вынік быў такі нечаканы, што выклікаў шок у большасці палітолагаў, замежных дыпламатаў, якія прадказвалі мааісцкай кампартыі ад сілы трэцяе месца. Здзівіў ён нават самога правадыра мааістаў Пушпу Камала Дахау. Асноўнай іх мэтай, як заяўляюць самі мааісты, з'яўляецца звяржэнне манархіі, знішчэнне феадалізму, каставай дыскрымінацыі і ўтварэнне сацыялістычнай дзяржавы мааісцкага тыпу. Шмат хто кажа пра тое, што насельніцтва вырашыла даверыць радыкалам кіраванне краінай, таму што традыцыйныя партыі — Непальскі нацыянальны кангрэс і Аб'яднаная камуністычная партыя, якая прытрымлівалася сацыял-дэмакратычных ідэй, — канчаткова скампраметавалі сябе (яны займаліся выключна інтрыгамі і рэалізацыяй уласных матэрыяльных інтарэсаў). Не апошнюю ролю адыграў і лозунг мааістаў «Зямлю сялянам!», паколькі большасць непальцаў — беззямельныя сяляне.

28 мая 2008 года ў 23.26 па мясцовым часе Устаноўчы Сход Непала 560 галасамі супраць 4 абвясціў Непал Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікай. Было ўстаноўлена, што выканаўчую ўладу ўзначаліць прэм'ер-міністр. Такім чынам, з карты свету знікла адзіная ў гісторыі індуісцкая манархія, дзе кароль лічыўся ўвасабленнем бога Вішну. У былым каралеўскім палацы зрабілі музей.

### БЕЗ БУФЕРА

Пушпа Камал Дхал стаў першым прэм'ер-міністрам рэспублікі Непал, аднак неўзабаве сышоў у адстаўку з-за адмовы прэзідэнта звольніць галоўнакамандуючага непальскай арміяй. Яго вяртанне на пасаду прэм'ера стала вынікам вынясення парламентам вотуму недаверу прэм'ер-міністру Кхадге Прасад Шарма Олі, лідару Камуністычнай партыі Непала (аб'яднанай марксісцка-ленінскай). Камал Дахау — выхадзец з сям'і сялян-брахманаў. Ён скончыў універсітэт, вывучыўся на агранома, працаваў школьным настаўнікам у вёсцы. Пад уплывам марксісцкіх ідэй далучыўся да рэвалюцыянераў-мааістаў, уступіў у камуністычную партыю, у 1986 годзе стаў яе генеральным сакратаром і здолеў кансалідаваць вакол сябе шматлікія левырадыкальныя групоўкі, стварыўшы адзіную левую апазіцыю. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне ў Непале, дзе і заслужыў сваю мянушку Прачанда (Люты). Ён вядомы як аўтар спецыфічнай дактрыны непальскага камунізму — «Шляхі Прачанда», заснаванай на ідэях Карла Маркса, Уладзіміра Леніна, Іосіфа Сталіна і Маа Цзэдуна.

Непал не мае выхаду да мора і багатых мінеральных рэсурсаў і застаецца адной з самых бедных краін свету. Асноўная частка насельніцтва занята ў лясной і сельскай гаспадарцы. У Непале апрацоўваюць рыс, кукурузу, ячмень, проса, чай, тытунь, некаторыя пладовыя культуры. Маленькая горная краіна жыве за кошт турызму. Штогод сюды прыязджае каля паўмільёна чалавек. У сярэднім кожны турыст пакідае ў краіне па 1 тысячы долараў. Да 1951 года каралеўства было абсалютна закрытае для наведвання замежнымі грамадзянамі. Менавіта таму цяпер у Непале засталося шмат не кранутых часам тэрыторый, дзікіх лясоў, архітэктурных помнікаў, самабытных вёсак. Прырода тут вельмі разнастайная — ад субтрапічных раслін да чароўных горных вяршыняў. У краіне ёсць багатыя прыродныя запаведнікі і нацыянальныя паркі, дзе жыве больш за 800 відаў млекакормячых і птушак, дзікіх жывёл (такіх як леапарды, насарогі, тыгры, карлікавыя мядзведзі і іншыя).

Па думку экспертаў, краіна мае патрэбу як у тэрміновай гуманітарнай дапамозе (пастаўках паліва і прадуктаў харчавання ў першую чаргу), так і ў правядзенні эканамічных рэформаў, што без знешняй падтрымкі выглядае немагчымым. З абвяшчэннем Непала свецкай рэспублікай знікла не толькі адзіная ў свеце індуісцкае каралеўства, але і буферная зона паміж Індыяй і Кітаем. Гэтаму параўнальна невялікаму каралеўству ў Гімалаях, населенаму шасцю дзясяткамі разнамоўных народнасцяў, у эпоху татальнага раздзелу свету паміж каланіяльнымі дзяржавамі выпаў лёс аднаму з нешматлікіх застацца незалежным.

Рэцэпт каралёў — адна краіна, адна вера, адна мова — даказаў сваю неэфектыўнасць. Мааісты, гэтак папулярныя цяпер у Непале, апелюючы да самых збяднелых і бяспраўных слаёў насельніцтва, умела гулялі на супярэчнасцях тутэйшага грамадства. Але стракатасць нацыянальнасцяў, кастаў, рэлігій, моў, вялікая розніца ў развіцці паміж раёнамі краіны ўяўляе велізарную праблему. Галоўнае пытанне — ці здолеюць мааісты ў такіх умовах захаваць адзінства краіны і забяспечыць эканамічны рост — пакуль застаецца адкрытым.



Захар БУРАК. burak@zviazda.by